## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**А. А. Любчанка**

# РАСКРЫЦЦЁ ПРАБЛЕМЫ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЙ АДЗІНОТЫ Ў КАНТЭКСЦЕ АДКАЗНАСЦІ ЗА ЎЛАСНЫ ВЫБАР (на прыкладзе рамана В. Казько «Неруш»)

У артыкуле на матэрыяле рамана В. Казько «Неруш» даследуецца праблема экзістэнцыяльнай адзіноты ў кантэксце адказнасці за ўласны выбар. У філасофскай парадыгме экзістэнцыялізму аналізуецца вобраз і матывацыя ўчынкаў галоўнага героя, уздзеянне на яго другарадных персанажаў. Звяртаецца ўвага на ролю сімвалічных вобразаў у раскрыцці праблематыкі рамана і асэнсаванне ў творы шэрагу іншых экзістэнцыяльных праблем: абсурднасці быцця, экзістэнцыяльнай закінутасці, выбару ў памежнай сітуацыі, адчужанасці.

Праблема экзістэнцыяльнай адзіноты з’яўляецца адной з маладаследаваных у літаратуразнаўстве, бо звычайна пры разглядзе экзістэнцыяльных пытанняў найбольшая ўвага звяртаецца выключна на праблему выбару і адказнасць за яго. *Мэта* нашага даследавання – раскрыццё праблемы экзістэнцыяльнай адзіноты ў кантэксце адказнасці за ўласны выбар. Матэрыялам для даследавання паслужыў раман В. Казько «Неруш».

Творчасць В. Казько з-за сваёй філасофскай глыбіні і тэматычнай разнастайнасці неаднаразова станавілася прадметам літаратуразнаўчых прац. Вывучэннем набыткаў празаіка займаюцца А. А. Васілевіч, Г. М. Друк, М. А. Тычына, Т. М. Тарасава, Г. В. Навасельцава і інш. Даследчыкаў цікавяць філасофскія ідэі В. Казько, сімволіка і міфалагізм яго твораў, аўтабіяграфічнасць, а таксама актуальныя праблемы рэчаіснасці, якія па-мастацку асэнсоўвае аўтар. Метадалогія нашага даследавання была выпрацавана на аснове сістэматызацыі навуковых работ папярэднікаў.

Віктар Казько – выбітны беларускі пісьменнік, які нарадзіўся на Палессі, з якім непарыўна звязана і яго творчасць. На працягу жыцця ён быў вымушаны шмат вандраваць: палескія дзіцячыя дамы, Сібір, Мінск. Перажыванні, звязаныя з перыпетыямі біяграфіі пісьменніка, так ці інакш знайшлі адлюстраванне ў яго прозе. Напрыклад, перажытая ў дзіцячыя гады вайна стала асновай для рамана «Суд у Слабадзе», а сібірскі перыяд увасобіўся ў «Бунце незапатрабаванага праху». Аўтабіяграфічнасць, уласцівая многім творам В. Казько, яскрава праяўляецца і ў рамане «Неруш», які цалкам прысвечаны роднай зямлі празаіка – Палессю. «Ужо з першых старонак, – зазначае М. У. Канцавая, – выяўляюцца рэгіянальныя асаблівасці яго твораў, непаўторны і самабытны свет палешукоў, іх светаўспрыманне» [1, с. 120]. Праз зварот да побыту палешукоў В. Казько ўздымае ў творы актуальныя пытанні сучаснасці, у ліку якіх экалагічныя праблемы і заняпад духоўнасці ў грамадстве. Багаты жыццёвы вопыт, а таксама веданне палешукоў і Палесся

знутры дапамаглі стварыць непаўторныя рэалістычныя вобразы, праз якія раскрываюцца ўся глыбіня і супярэчлівасць экзістэнцыяльных перажыванняў чалавека, што сутыкнуўся з выбарам паміж матэрыяльным светам з яго спажывецкімі тэндэнцыямі і светам духоўным; паміж тэхнічным развіццём і захаваннем чысціні навакольнага асяроддзя для будучых пакаленняў. Як адзначае У. В. Гніламёдаў, «маральнай асаблівасцю нашай літаратуры было тое, што яна заўсёды судакраналася з народным лёсам, з усім тым, з чым гэты лёс быў звязаны» [2, с. 102]. В. Казько заўсёды адпавядаў гэтай асаблівасці: лёс народа і яго будучыня ўжо доўгі час з’яўляюцца рухавіком творчасці пісьменніка.

На думку А. І. Бельскага, «нацыянальны свет у шырокім разуменні – прыроднае асяроддзе (краявіды, раслінны свет, фаўна, кліматычныя ўмовы і інш.), духоўны і культурны змест існавання, звязаны з пэўным уладкаваннем побыту, традыцыямі этнасу – пэўнай чалавечай супольнасці або нацыі» [3, с. 11]. Экалагічная катастрофа – пагроза для нацыянальнага свету не толькі з пункта гледжання разбурэння гармоніі ў прыродзе, але і з пазіцый духоўнасці. Да праблем з экалогіяй вядуць дзеянні маральна спустошанага чалавека, які па сутнасці страціў духоўны і культурны сэнс існавання. «Неруш» – раман-прадбачанне, своеасаблівая беларуская антыўтопія, якая пакідае шмат пытанняў аб тым, што далей будзе з чалавецтвам, калі яно працягне такімі ж тэмпамі руйнаваць усё жывое вакол сябе. Наяўнасць апакаліптычных матываў у рамане адзначае даследчыца Г. В. Навасельцава: «Пісьменнік асэнсоўвае меліярацыю не толькі як знішчальную прыродную з’яву, але і як пачатак знішчэння чалавекам самога сябе» [4, с. 96].

Назва рамана мае сімвалічнае значэнне. Само па сабе слова *неруш* абазначае месца, куды не ступала нага чалавека, штосьці некранутае, чыстае, спрадвечнае. У кантэксце твора слова набывае іншую семантыку: «Не-руш!» гучыць заклікам да чалавека не забруджваць наваколле. Такім чынам, назва рамана адлюстроўвае адну з асноўных праблем: праблему негатыўнага ўздзеяння чалавека на прыроду. Карысная на першы погляд меліярацыя балот вылілася ў сапраўдную трагедыю для палескай вёскі Княжбор і яе жыхароў. Наступствы такога кшталту экалагічных катастроф яшчэ шмат год будуць уплываць на жыццё людзей у пацярпелым рэгіёне. Так адбылося і ў Княжборы. Сімвалам сур’ёзных наступстваў працы меліяратараў стаў момант, калі галоўны герой рамана Мацвей Роўда выпадкова вырваў у лесе грыбніцу, маці ўсіх грыбоў. «Э, хлопча, што ж ты натварыў? – Дзед Дзям’ян з жахам і асуджэннем глядзеў на Мацвея. – Шчаслівы ты і няшчасны. Цяпер тры гады можаш не хадзіць у лес» [5, с. 57], – папракаў Мацвея яго дзед. А грыбніца, як і палеская зямля пасля меліярацыі, «плакала, галасіла, як горкае дзіця, што згубіла маці» [Там жа, с. 58]. У гэту хвіліну «Мацвей і сам не заўважыў, як выраніў слязу па гэтае жывое і галаснае, сляза ўпала, закіпела і як выпарылася, растала, нібыта і не падала» [Там жа].

Эпізод з вырванай грыбніцай стаў адлюстраваннем экзістэнцыяльных пакут Мацвея Роўды, які нарадзіўся ў вёсцы Княжбор і праз шмат год

вярнуўся ў свой родны край, каб асушыць яго балоты. Душэўны боль галоўнага героя падкрэсліваецца аўтарам у самым пачатку рамана, калі «Мацвей Роўда адчуваў, што і сам ён высмяг. Усё было жорстка, крохка і хістка ў ім» [5, с. 12]. У гэты момант ён бачыў драматычную сцэну: буслы выганялі са сваёй чарады іншага бусла (ці антона, як называюць гэтых птушак на Палессі). Выгнаны бусел быў няўдалым, слабым, таму чарада вырашыла пакінуць яго, каб не згубіць у дарозе. Птушкі зрабілі такі экзістэнцыяльны выбар, на які чалавек наўрад ці рашыўся б. У рамане «Неруш» палешукі не раз параўноўваюцца з бусламі: «Верацьь сваймy суседу-буслу, прыглядаюцца да яго жыцця, прадугадліва будуюць сваё жыццё…» [5, с. 18]. Па гэтай прычыне вобраз нікому не патрэбнага самотнага бусла можна лічыць адпаведнікам вобраза Мацвея Роўды. Сваімі знішчальнымі для прыроды дзеяннямі ён стаў лішнім на сваёй малой радзіме. Бусел-выгнаннік – сімвал экзістэнцыяльнай адзіноты, якую спазнаў галоўны герой. Дадзеную паралель пацвярджаюць словы аўтара: «Адзін толькі бусел застаўся на зямлі. Бусел і Мацвей Роўда на пустой дарозе» [5, с. 20].

Раман «Неруш» мае непаслядоўную структуру аповеду, таму сцэна, якая распачынае твор, адносіцца да часу, калі Мацвей ужо здзейсніў сваё галоўнае злачынства: паспрыяў асушэнню балот і гэтым асудзіў Княжбор на доўгія пакуты. Галоўны герой стаў чужым для сваіх, разбуральнікам усяго, чым жылі княжборцы: «…бусел выгнаны з чарады за тое, што быў нядужым, Мацвея аднавяскоўцы праклінаюць за тое, што не змог зберагчы сваю зямлю» [4, с. 97]. Мацвей хацеў для сябе і для сваіх землякоў лепшага, багатага на ўраджаі жыцця, але, здаецца, карысная справа прывяла за сабой сапраўдную бяду: спякоту, сухавеі, а потым яшчэ і паводку. Прага Мацвея да такіх радыкальных змен тлумачыцца галодным (як і ў многіх людзей таго часу) дзяцінствам. Знаходзячыся ў складзе меліярацыйнай групы, ён атрымаў сапраўдную магчымасць «палепшыць» жыццё палешукоў. Даследчык А. У. Жардзецкая слушна зазначае: «Жыццё паставіла перад ім выбар – балоты ці хлеб» [6]. Нягледзячы на тое, што Мацвей у выніку абраў другое, экзістэнцыяльны выбар (рашэнне ўзяцца за меліярацыйную працу) не даўся яму лёгка. Душэўныя перажыванні героя праяўляліся яшчэ перад асушэннем, яму было шкада сваёй роднай вёскі. Пяшчотнаму стаўленню Мацвея да Палесся і прыроды ў цэлым з самага дзяцінства вучыў яго дзед Дзям’ян. Менавіта таму галоўны герой адчуваў экзістэнцыяльную адказнасць за будучыню свайго рэгіёна. З роднай вёскай Мацвея звязвалі і ўспаміны пра бацькоў, якія загінулі, а таксама думкі пра каханую дзяўчыну.

На Палессі Мацвей адчуваў сваю прывязанасць да малой радзімы, а ў адрыве ад яе ён пачынаў усё больш цягнуцца да свайго новага жыцця: «Уступаючы гасціннасці, безжурботнасці чужога краю, на хвіліну, тыдзень, месяц забываўся аб няпростасці, патаемнасці свайго Палесся, грэючыся пад чужым сонцам» [5, с. 75]. Гэтым тлумачыцца дваістасць яго поглядаў: з аднаго боку, гэта чалавек, які шануе Палессе з яго прыроднымі скарбамі, а з іншага – сучасны гарадскі жыхар, падуласны прагрэсіўным, але не заўсёды

ўдалым і канструктыўным ідэям. Сімвалам унутраных пошукаў і супярэчлівасцей галоўнага героя стала яго спроба наўмысна пераўтварыцца з вяскоўца ў гарадскога жыхара для таго, каб збегчы ад унутраных перажыванняў: «І ён аддаўся гораду, здаўся яму, спадзеючыся на яго літасць і наблажлівасць на схоне дня. І Мацвей адчуў, што яму амаль што хораша» [5, с. 76]. Галоўнаму герою сапраўды было хораша не да канца, бо яго пакуты не заканчваліся: «Ён усё яшчэ нічога не вырашыў і не мог наважыцца на якое-небудзь рашэнне. Жаданні і сумненні раздзіралі яго на часткі» [5, с. 80]. Разам з тым ён не верыў, што яго ў якасці меліяратара змогуць прыняць аднавяскоўцы. У рэшце рэшт жаданне ісці за тэндэнцыямі сучаснасці пераважыла. Спалучэнне ў Мацвеі двух супрацьлеглых пунктаў гледжання, якія аб'ядналі ў адным чалавеку сапраўднага палешука і дзеяча-меліяратара, паспрыяла фарміраванню той пазіцыі, якой ён кіраваўся падчас прыняцця лёсавызначальнага рашэння. Гэта не апраўдвае галоўнага героя, але дазваляе зразумець, чым кіраваўся Мацвей Роўда, робячы цяжкі экзістэнцыяльны выбар.

Нельга сцвярджаць, што Мацвей рабіў гэты выбар поўнасцю самастойна. Вялікае і пераважна негатыўнае ўздзеянне на героя аказаў яго калега і кіраўнік Алег Віктаравіч Шахрай. У адрозненне ад Мацвея, ён змог пазбегнуць адказнасці за свае ўчынкі, своечасова заняўшы больш высокую пасаду. Менавіта Шахрай навязаў Мацвею ідэю аб неабходнасці тэхнічных пераўтварэнняў як адзінага і неабходнага варыянту далейшага развіцця вёскі. Слухаючы двух аўтарытэтных для сябе людзей, дзеда Дзям'яна і Шахрая, Мацвей блытаўся, і яго экзістэнцыяльны выбар стаў ячшэ больш складаным: «Узаемастасункі галоўнага героя з гэтымі палярнымі вобразамі прадвызначаюць дваіснасць яго светапогляду, што абумоўлівае ўнутраны канфлікт і драматызацыю раманнага дзеяння» [4, с. 96]. У выніку можна сцвярджаць, што пазіцыя Шахрая стала прыярытэтнай для Мацвея, хаця той не раз выражаў сваё стаўленне да балот і прыроды ўвогуле: «Гэта можна толькі ненавідзець» [4, с. 62].

Павага да Шахрая і сяброўства з ім абумовілі экзістэнцыяльны выбар Мацвея – узяць на сябе адказнасць і стаць сапраўдным меліяратарам. «Усё новае бязлітасна да старога» – вось пазіцыя Шахрая. Ён прывіваў яе свайму пратэжэ і кіраваўся ёй ва ўласных дзеяннях. Алег Віктаравіч ні разу не пашкадаваў аб сваіх учынках. Пасля таго, як на Княжбор абрушылася кара прыроды, ён нават не хацеў слухаць Мацвея. Шахрай, падняўшыся па кар'ернай лесвіцы, успрыняў галоўнага героя як чарговага карыслівага «сябра», які сам вінаваты ў сваіх нястачах: «А што Шахраю нейкі там старшыня калгаса, хаця ён і хадзіў з тым старшынёю ў адным хамуце, цягнуў адзін воз. Толькі калі тое было. Цяпер жа хамут у яго другі і карэннікі другія, а такіх, як Мацвей, сотні» [5, с. 40]. Шахраю было працей не зважаць на праблемы меліярацыі, бо ён быў у баку ад усіх наступстваў і ведаў пра небяспеку асушэнняў, але дзейнічаў у адрыве ад канкрэтных трагічных выпадкаў. Ім кіравала вялікая ідэя, важнейшая за лёсы невялічкіх вёсак і іх

жыхароў. Такі погляд Шахрая можна параўнаць з пазіцыяй вайсковага кіраўніка, згодна з якой жыццё аднаго чалавека, а можа і некалькіх тысяч – нішто ў параўнанні з пасляховым вынікам баявых дзеянняў. Алег Віктаравіч упэўнены ў сваіх дзеяннях, у ім увасабляецца бязлітасная і бяздумная прага да выканання задачы, пастаўленай вышэйшай уладай: «Меліяратары працуюць, робяць сваю справу. Ты першы завыў, заенчыў, яны маўчаць, грамадскасць, вучоныя – усе ў адну дудку: бедная прырода, бедная прырода, прырода-маці, а хлеб, што мы далі, жаруць. І ты з гэтага хору едакоў. Крыху вымачыла, крыху прымарозіла, крыху высушыла, пылам цябе ахапіла – ты ўжо і сканаў. А галоўны бой яшчэ наперадзе» [5, с. 41].

«Як далей пераканаўча паказвае пісьменнік, для тых, хто не беражэ жывое, вартасці пазбаўляецца і чалавечае жыццё» [4, с. 96]. Жыццё княжборцаў не цікавіла Шахрая, захопленага глабальнымі мэтамі. Мацвей жа адчуваў экзістэнцыяльную адказнасць за кожнага, бо ведаў аднавяскоўцаў паасобку, не ставіўся да іх, як да безаблічнай грамады. Гэта значна ўзмацняла яго боль і пачуццё экзістэнцыяльнай адзіноты. Ён стаў непатрэбны не ўсяму грамадству, а кожнаму канкрэтнаму чалавеку. Перш за ўсё гэта датычыцца дзеда Дзям’яна, які расчараваўся ў сваім унуку. У той жа час жыхары вёскі Княжбор не ідэалізуюцца: некаторыя з іх яшчэ да прыходу меліяратараў адмоўна ўплывалі на прыроду, высякаючы дуброву. Пісьменнік аддае шмат увагі асобным гісторыям княжборцаў, каб паказаць, што грамадства складаецца з індывідуальнасцей і кожны ў экзістэнцыяльнай памежнай сітуацыі паводзіць сябе па-свойму. Такім чынам, персаналізацыя канкрэтнага героя мае важнае значэнне пры раскрыцці ўсеагульнай трагедыі.

У рамане «Неруш» персаналізуюцца і міфалагізуюцца сілы прыроды. Можна сцвярджаць, што прырода і прыродныя сілы з’яўляюцца асобнымі героямі рамана, якія істотна ўплываюць на падзеі ў ім. Жалезны чалавек, Галоска-галасніца, балотны бугай выступаюць у рамане сімваламі неўтаймаванай, неспакойнай сілы, якая пакутуе, якая прадбачыць і папярэджвае сваёй прысутнасцю пра нешта нядобрае. Жалезны чалавек, напрыклад, з’яўляецца ў начным Княжборы, чым палохае жыхароў і папярэджвае пра трагедыю, якой не пазбегнуць, калі не змяніць сваё стаўленне да прыроды. Гэтыя істоты не нясуць негатыву, яны суправаджаюць, а часам і ахоўваюць княжборцаў, сімвалізуюць сувязь вяскоўцаў і прыроды. Але гэта сувязь руйнуецца разбуральнай дзейнасцю чалавека, з-за якой будучыня становіцца нявызначанай і небяспечнай.

Такім чынам, тая экзістэнцыяльная адзінота, якую спазнаў галоўны герой рамана «Неруш», была абумоўлена яго ўласнымі ўчынкамі. Ад яго адвярнуліся ўсе: аднавяскоўцы разам з дзядулем, прырода і увесь свет наогул. З-за сваёй дзейнасці Мацвей апынуўся ў абставінах, калі сітуацыя ўжо выйшла з-пад кантролю і ён ні на што не мог уплываць. Прыродная катастрофа ў выніку меліярацыі – памежнае становішча, у якім герой пазбавіўся права экзістэнцыяльнага выбару і мог разлічваць толькі на знешнія сілы. Бязвыхаднасць і бессэнсоўнасць любых дзеянняў Мацвея

ў пачатку і канцы рамана яднаюць яго з абсурдным чалавекам, які не мае дакладных арыенціраў у жыцці, які згубіў сэнс ва ўсім і павінен дзейнічаць толькі па прычыне сваёй экзістэнцыяльнай закінутасці. Вобраз Мацвея Роўды – гэта папярэджанне ўсім сучаснікам, напамін пра экзістэнцыяльную адказнасць у часы ўсё большай эксплуатацыі прыродных рэсурсаў, пра тое, што любы чалавек можа страціць сваё чалавечае аблічча, згубіцца ў гэтым свеце, пайсці па шляху самазнішчэння.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Канцавая, М. У.* Рэгіянальныя асаблівасці рамана Віктара Казько «Неруш» / М. У. Канцавая // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2015. – № 2 (46). – С. 119–123.
2. *Гніламёдаў, У. В.* Літаратура і сучаснасць / У. В. Гніламёдаў // Доклады Национальной академии наук Беларуси. – 2015. – № 5 (59). – С. 102–106.
3. *Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура ХХ стагоддзя: гісторыя і сучаснасць: у дапамогу наст. і студ. / А. І. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 441 с.
4. *Навасельцава, Г. В.* Жанравая эвалюцыя рамана-антыўтопіі ў беларускай літаратуры (на прыкладзе твораў «Неруш» Віктара Казько і «П'яўка» Юрыя Станкевіча) / Г. В. Навасельцава // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2016. – № 10. – С. 95–99.
5. Казько, В. Неруш : раман / В. Казько. – Мінск : Мастац. літ., 1983. – 430 с.
6. *Жардзецкая, А. У.* Чалавек – гісторыя – час у творах В. Казько / А. У. Жардзецкая // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI веков. К 70-летию кафедры русской литературы : сб. науч. ст. : в 2 ч. / под ред. проф. С. Я. Гончаровой-Грабовской. – 2010. – Ч. 1 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://elib.bspu.by/handle/doc/11733. – Дата доступу : 25.05. 2019.



The article discusses the problem of existential loneliness followed by responsibility for one's own choice, on the basis of the novel *Nerush* by V. Kazko. The image of the main character, his actions and motivation, the influence of minor characters on the protagonist are analyzed in detail in the philosophical paradigm of existentialism. The author draws attention to the role of symbolic images in the the novel's problematics, understanding other problems of existentialism: the absurdity of being, existential abandonment, choice in the marginal situation, and alienation.



*Поступила в редакцию 13.06.2019*



**Л. В. Первушина**


## ЖАНРОВОЕ СВОЕОБРАЗИЕ ТВОРЧЕСТВА ДОЙНЫ ГАЛИЧ БАРР


В статье рассматриваются художественные эксперименты в творчестве Дойны Галич Барр (1932–2010) – известной современной американской писательницы сербского происхождения. Выявляется жанровое своеобразие ее произведений, подчеркиваются изменчивость, гибкость и динамичность жанра романа, его способность модифицироваться